2022 год
ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

# Звесткі з архіва Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2022 год з’яўляецца юбілейным.*

# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ




## 95 гадоў

**Маўр, Я. Чалавек ідзе / Я. Маўр. – Мінск : Чырвоная змена, 1927. – 63 с., [1] с.**

*Першая ў беларускай літаратуры навукова-фантастычная аповесць Івана Міхайлавіча Фёдарава (1883–1971), які больш вядомы чытачам як Янка Маўр.*

*У выданні змяшчаліся ілюстрацыі, аформленыя выдатным беларускім мастаком-графікам А. М. Тычынам (1897–1986).*

*Тыраж – 2 000 экзэмпляраў.*

# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ




*Спачатку аповесць «Чалавек ідзе» была надрукавана ў часопісе «Беларускі піянер» (друкавалася ў ім з канца 1926 г.). На той час яе аўтар, Іван Міхайлавіч Фёдараў, працаваў выкладчыкам у 25-й мінскай чыгуначнай школе, яму было 44 гады. Каб не дубліраваць імя і прозвішча вядомага рускага першадрукара Івана Фёдарава (?—1583 гг.), настаўнік выбраў сабе псеўданім — Янка Маўр, у якім імя стала маркерам прыналежнасці да роднай Беларусі, а прозвішча сімвалізавала ўстаноўку на пазнавальнасць, прыгодніцтва, інтарэс да далёкіх экзатычных краін.*

# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

*У аповесці «Чалавек ідзе» Янка Маўр звярнуўся да жыцця першабытнага чалавека і засяродзіў увагу на найбольш драматычных, напружаных момантах яго жыцця: смерць дзядулі, жанчыны з дзіцём, выратаванне чалавека з багны, авалоданне агнём, з якім звязваецца радасць і гора. Ёсць у аповесці і дзеючыя асобы — Краг, дзяўчына Агу, хлопчык Ра, хоць у той час чалавек, член гурту, яшчэ не вылучаў сябе з навакольнага асяроддзя. У творы прысутнічаюць элементы прыгодніцтва, таямнічыя і загадкавыя загалоўкі раздзелаў, казачны зачын: «Гэта было даўно-даўно... Можа мільён гадоў назад».*

*Напісаў жа сваю аповесць Іван Міхайлавіч яшчэ ў 1920 годзе. Пазней ён успамінаў: «Мне як настаўніку хацелася стварыць для сваіх вучняў нешта накшталт вучэбнага дапаможніка, каб яны маглі канкрэтней уявіць праблему паходжання чалавека. Апрача таго, размову на гэтую тэму я лічыў карысна яшчэ і таму, што ў той час даволі моцна трымалася вера ў боскае паходжанне чалавека, часам яна пераходзіла і да дзяцей».*

# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

*У чытачоў аповесць «Чалавек ідзе» мела вялікі поспех. Яна неаднаразова перавыдавалася і была перакладзена на многія мовы свету, як і іншыя творы, што потым былі напісаны Янкам Маўрам: «У краіне райскай птушкі», «Сын вады» (1928), «Пекла» (1929), «Слёзы Тубі», «Палескія рабінзоны», «Амок» (1930), «ТВТ» (1934), «Шлях з цемры» (1948), «Апавяданні» (1951) і інш.*





*У творах пісьменніка, незалежна ад тэмы і сюжэта, чырвонай ніткай праходзяць ідэі дабра і чалавечнасці, таму невыпадкова, што ў 1983 годзе ў адпаведнасці з рашэннем ЮНЕСКА стагоддзе Янкі Маўра адзначалася ва ўсім свеце.*

# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

*Сёння пачытаць аповесць Янкі Маўра «Чалавек ідзе» можна на сайце беларускай электроннай бібліятэкі «Беларуская палічка»:*

[https://knihi.com/Janka_Maur/Calaviek_idzie.html](https://knihi.com/Janka_Maur/Calaviek_idzie.html)